*Альховік М.К.*

# ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫКЛАДАННІ СПЕЦКУРСАЎ ПА ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ І ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя.** У рабоце разглядаюцца асаблівасці выкладання спецкурсаў па гісторыі этнічных супольнасцяў Беларусі студэнтам і магістрантам гістарычных спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі.

*Ключавыя словы: вышэйшая адукацыя, гісторыя этнічных супольнасцей, гісторыя этнічных груп, выкладанне гісторыі.*

*Alkhovik M.K.*

# ON THE QUESTION OF THE TEACHING THE SPECIAL COURSE ON THE HISTORY OF NATIONAL MINORITIES AND ETHNIC COMMUNITIES OF BELARUS

*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract**. The article discusses the features of teaching special courses on the history of ethnic communities of Belarus to students and master's students of historical specialties of higher education institutions of Belarus.

*Keywords: higher education, history of ethnic communities, history of ethnic groups, teaching history.*

У апошнія дзесяцігоддзі прыкметна ўзрасла цікавасць айчынных даследчыкаў да вывучэння гісторыі нацыянальных меншасцей і этнічных супольнасцей Беларусі. У шэрагу ўстаноў вышэйшай адукацыі (УВА) студэнтам і магістрантам гістарычных спецыяльнасцей прапануюцца спецкурсы па гісторыі нацыянальных груп, нацыянальнай палітыкі, этнічных працэсаў, малых дыяспар Беларусі і г.д. Вывучэнне дадзеных дысцыплін дапамагае навучэнцам, сярод іншага, у засваенні этнанацыянальнай праблематыкі, складанай тэрміналогіі этнасацыяльных дысцыплін, аналізе этнічных (нацыянальных) працэсаў у мінулым і ў сучасным свеце, падрыхтоўцы аналітычных матэрыялаў для абгрунтавання варыянтаў магчымых наступстваў прыняцця кіруючых рашэнняў з апорай на гістарычны вопыт.

Выбар дадзеных спецкурсаў прадыктаваны неабходнасцю падрыхтоўкі кваліфікаванага спецыяліста з шырокім даляглядам, сістэмай ведаў пра этапы этнічнай гісторыі Беларусі, пра гістарычны шлях і вектары далейшага развіцця этнічных супольнасцей, які ўмее глыбока аналізаваць падзеі і з'явы нацыянальнай сферы ў цеснай сувязі мінулага, сучаснага і будучага, аргументавана і дакладна фармуляваць уласную пазіцыю па актуальных пытаннях нацыянальнага жыцця краіны, ажыццяўляць міждысцыплінарны падыход (этнагісторыя, этнаграфія, этнапаліталогія, этнасацыялогія,

этнадэмаграфія, этнаканфлікталогія, этнапсіхалогія, этналінгвістыка, этнічная антрапалогія, этнарэгіяналістыка і інш.) [1; 2; 3]. Апрача таго, ва ўмовах будаўніцтва незалежнай Рэспублікі Беларусь выпрацоўка арыенціраў нацыянальнай палітыкі, захаванне міжнацыянальнага міру на беларускіх землях з'яўляецца адной з першачарговых задач, якія стаяць перад дзяржавай і грамадствам. У гэтай сувязі ацэнка вопыту работы дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў у сферы вырашэння нацыянальнага пытання на беларускіх землях у розныя гістарыныя перыяды дазваляе вызначыць магчымыя прыярытэты і перспектывы нацыянальнага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Пазітыўны досвед міжэтнічнага ўзаемадзеяння можа актыўна выкарыстоўвацца ў палітыка-ідэалагічнай рабоце ў Беларусі [4] і ў прасоўванні адпаведнага іміджу нашай рэспублікі за мяжой (у якасці візітнай карткі).

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне асаблівасцей выкладання спецкурсаў па гісторыі этнічных супольнасцяў Беларусі студэнтам (магістрантам) гістарычных спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі. У фармуляванні высноў дапамагае аналіз вынікаў навучання і выкладання магістрантам БДУ спецкурса «Этнічныя групы Беларусі: гісторыя, культура і сацыяльна-прававое становішча», а таксама аналіз зместу праграм па падобных спецкурсах для студэнтаў (магістрантаў) гістарычных спецыяльнасцей іншых УВА.

Перад тым, як прыступіць да выкладання асноўнага зместу дысцыпліны, варта ўвесці студэнтаў (магістрантаў) у этнанацыянальную праблематыку. Вывучэнне і аналіз пэўных нацыянальных праблем немагчымы без узнаўлення ведаў (азнаямлення) студэнтаў з сучаснымі падыходамі да паняццяў (тэрмінаў) «нацыя», «этнас», «народ», «этнічная група», «этнаканфесійная група», «этнічная меншасць», «карэнны народ», «тытульная нацыя», «нацыянальная меншасць», «нацыянальная супольнасць», «дыяспара», «этнічная самасвядомасць», «родная мова», «дзяржаўная мова» і «нацыянальная мова», «мультыкультуралізм», «плавільны кацёл» і г.д. Блытаніна альбо спрэчныя сцвярджэнні (напрыклад, аб выцясненні паняцця «этнічная нацыя» тэрмінам «палітычная нацыя», нібыта дыскрымінацыйным характары тэрміна «нацыянальная меншасць», атаясамліванне паняццяў «інтэрнацыяналізм» і «вялікадзяржаўны шавінізм», «русіфікацыя» і «сацыялістычная культура», «беларуска-літоўская» і «славяна-балцкая» мяжа) у некаторых навуковых публікацыях здольныя заблытаць і дэзарыентаваць навучэнцаў. На нашую думку, адной з задач выкладчыка з'яўляецца ажыццяўленне ўваходнага кантролю ведаў, уменняў і навыкаў не толькі па гісторыі нацыянальных супольнасцей і нацыянальнай палітыкі, але і этнічнай карціны свету, а таксама асаблівасцей нацыянальнага развіцця Беларусі, сучасных актуальных этнанацыянальных праблем, ён павінен выявіць ступень гатоўнасці навучэнцаў да вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці, скарэктаваць індывідуальныя заданні і падыход да студэнтаў (магістрантаў). Напрыклад, неабходна выявіць у навучэнцаў рэшткавыя веды працэсаў этнагенезу, гістарычных формаў і прыкметаў этнасу.

Галоўнымі мэтамі знаёмства студэнтаў (магістрантаў) з айчыннай гістарыяграфіяй нацыянальных меншасцей Беларусі з’яўляецца вызначэнне этапаў вывучэння беларускімі даследчыкамі гісторыі нацыянальных супольнасцей, ацэнка іх напрацовак і выяўленне кола недаследаваных праблем. Зразумела, што аналіз гістарыяграфіі гісторыі этнічных супольнасцей Беларусі немагчымы без азнаямлення з напрацоўкамі замежных гісторыкаў. Замежныя публікацыі прысвечаны як этнанацыянальным працэсам на беларускіх землях, так і становішчу этнічных супольнасцей ва Усходняй Еўропе, Кіеўскай Русі, Вялікім княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, СССР, СНД, Еўропы, Усходняй Еўропы, «Еўразіі» і г.д.

Неабходна прааналізаваць нарматыўна-прававую базу Рэспублікі Беларусь па захаванні і забеспячэнні правоў асоб, якія прыналежаць да нацыянальных меншасцяў, асноўныя міжнародныя прававыя крыніцы па пытаннях этнічных супольнасцяў (Лігі Нацый, Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, дакументы Еўрапейскага Саюза, Садружнасці Незалежных Дзяржаў). Важна авалодаць тэрміналогіяй, якая выкарстоўваецца ў нарматыўна-прававых дакументах, афіцыйным справаводстве ў адносінах да нацыянальных груп, працэсаў і з’яў.

На нашую думку, адным з заданняў для кіраванай самастойнай работы з’яўляецца аналіз перапісаў Расійскай імперыі, РСФСР, БССР (СССР) і незалежнай Рэспублікі Беларусь па пытаннях мовы і нацыянальнасці. Галоўнай мэтай дадзеных заданняў з’яўляецца вызначэнне этгнанацыянальных і культурна-моўных працэсаў на беларускіх землях, а таксама напрамкаў нацыянальнай палітыкі ўлад.

Вывучэнне этнагенетычных працэсаў даіндаеўрапейскага і індаеўрапейскага перыядаў гісторыі Беларусі прадугледжвае вызначэнне этнічнай прыналежнасці насельніцтва археалагічных культур каменнага, бронзавага і жалезнага веку, выяўленне асаблівасцей фіна-угорскага, балцкага і славянскага перыядаў этнічнай гісторыі Беларусі, этнагенезу славян, славянізацыі балтаў, племяннной самасвядомасці, аналіз асноўных канцэпцый паходжання беларусаў, этнагенетычных працэсаў у розных рэгіёнах Беларусі, уплыву розных этнічных груп на працэсы фарміравання беларускага этнасу ў раннедзяржаўны перыяд, этнічных сувязей беларускіх земляў з суседнімі тэрыторыямі, міграцый рознаэтнічнага насельніцтва на тэрыторыю Беларусі. Асобную ўвагу неабходна прысвяціць дыскусійнаму пытанню пра існаванне старажытнарускай самасвядомасці, народнасці, мовы і культуры.

Студэнт (магістрант) павінен усведамляць, што без аналізу нацыянальных момантаў немагчымае поўнае разуменне грамадска-палітычных, эканамічных і сацыяльна-культурных працэсаў у краіне. Даследаванне працэсаў фарміравання і інстытуалізацыі этнічных груп на беларускіх землях ў часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, на нашу думку, павінна адбывацца ў наступнай паслядоўнасці: спачатку даецца характарыстыка сутнасці і эвалюцыі нацыянальнай палітыкі дзяржавы ў адносінах да этнічных меншасцей, этнічнага складу насельніцтва Беларусі ў цэлым, палітычнай і адміністрацыйнай эліты, шляхецкага саслоўя, духавенства, воінскіх падраздзяленняў, гарадскога,

местачковага і сельскага насельніцтва, а затым ідзе аналіз становішча нацыянальных меншасцей і іх культурнай адаптацыі. Асобна неабходна адзначыць аналіз працэсаў фарміравання беларускай народнасці і яе характэрных асаблівасцей, старабеларускай мовы і культуры, саманазваў беларускага этнасу, складання палітычнай нацыі Вялікага княства Літоўскага, ролі «руськага», «літоўскага» і «польскага» этнапалітычных і этнаканфесійных праектаў у фарміраванні беларускай народнасці. Гістарычны аналіз павінны закранаць розныя па колькасці этнічныя групы (ад яўрэяў, татар, цыган да шатландцаў і італьянцаў.

Аналіз становішча этнічных груп Беларусі ў перыяд іх знаходжання ў складзе Расійскай імперыі прадугледжвае характарыстыку нацыянальнай палітыкі ўлад Расійскай імперыі ў дачыненні да розных этнічных груп, вызначэнне асаблівасцей развіцця вялікіх і малых этнічных супольнасцей, міграцыйных працэсаў і этнічнай структуры насельніцтва Беларусі. Вывучэнне палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да розных этнічных супольнасцей Беларусі немагчыма без аналізу агульнаімперскага кантэксту. Разам з тым неабходна вызначыць уплыў “польскага” і “велікарускага” фактараў на станаўленне сучаснай беларускай нацыі, палітыкі паланізацыі і русіфікацыі. Асобную ўвагу неабходна ўдзяліць аналізу становішча этнічных груп у перыяд вайны 1812 г., а таксама Першай сусветнай вайны.

Адна з галоўных задач у вызначэнні змен у становішчы этнічных груп Беларусі ў 1920–1930-я гг. – параўнаць нацыянальную палітыку савецкіх улад і Другой Рэчы Паспалітай у дачыненні да этнічных груп Беларусі. Уз’яднанне беларускага народа ў адзінай савецкай сацыялістычнай дзяржаве ў 1939 г. было абумоўлена, сярод іншага, адрозненнямі ў падыходах савецкіх і польскіх улад да вырашэння нацыянальнага пытання на беларускіх землях. У першую чаргу навучэнцы павінны зразумець сутнасць падыходаў камуністычнай партыі і савецкай улады да вырашэння нацыянальнага пытання, нацыянальную праграму і стратэгічную нацыянальную лінію бальшавікоў. Неабходна сфарміраваць у свядомасці навучэнцаў уяўленне аб тым, што ў міжваенны перыяд савецкая нацыянальная палітыка прайшла складаны працэс эвалюцыі. Фенаменальны і ўнікальны для свайго часу перыяд спрыяльнай палітыкі ў дачыненні да нацыянальных меншасцей скончыўся ў выніку дэфармацыі прынцыпаў «ленінскай нацыянальнай палітыкі» ў 1933-1940 гг. Навучэнцы павінны разумець, што менавіта ў міжваенныя дзесяцігоддзі былі сфарміраваны некалькі падыходаў савецкіх улад да вырашэння нацыянальнага пытання ў Беларусі, акрэслены вектары нацыянальнага будаўніцтва ў пасляваенныя дзесяцігоддзі. Так, маецца шмат агульнага ў працэсах закрыцця польскіх школ у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў Заходняй Беларусі і аналагічных працэсах сярэдзіны-канца 1930-х гг. у раёнах Цэнтральнай і Усходняй Беларусі. Закрыццё яўрэйскіх установ у другой палове 1940-х гг. з’яўлялася заканамерным вынікам змен палітыкі ўлад у яўрэйскім пытанні ў даваенны час.

Вывучэнне гісторыі нацыянальных меншасцей у перыяд Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны мае вялікі выхаваўчы і ідэалагічны патэнцыял. Гітлераўская палітыка генацыду беларускага народа датычала як тытульнага

этнаса, так і нацыянальных меншасцей Беларусі. Адначасова ва Узброеных сілах СССР, партызанскім і падпольным руху на тэрыторыі Беларусі, у савецкім тыле, у руху Супраціўлення па-за межамі Савецкай дзяржавы прымалі ўдзел прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі Савецкай Беларусі. Неабходна вызначыць уклад прадстаўнікоў усіх нацыянальных груп Савецкай Беларусі, у тым ліку немцаў, у перамогу савецкага народа над нацызмам. Адначасова варта прааналізаваць выпадкі калабарацыянізму, а таксама ўдзелу ў дзейнасці нацыяналістычных фарміраванняў асобных прадстаўнікоў этнічных меншасцей Беларусі.

Пры вывучэнні становішча нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе неабходна вызначыць удзел дзяржаўных органаў усіх узроўняў, а таксама грамадскіх арганізацый у задавальненні нацыянальных патрэб этнічных груп Беларусі. Асобнае месца належыць аналізу ўстаноў, якія непасрэдна займаюцца нацыянальнымі пытаннямі ў рэспубліцы, значэння культурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца беларускай дзяржавай (міжнародны фестываль нацыянальных культур у г. Гродна і г.д.)

Такім чынам, наяўныя крыніцы, дасягненні беларускай і замежнай гістарыяграфіі па дадзенай праблеме дазваляюць стварыць у свядомасці навучэнцаў цэласную карціну гісторыі этнічных груп, садзейнічаць удасканальванню іх даследчыцкіх здольнасцей, разумення агульных гістарычных працэсаў на тэрыторыі Беларусі, нацыянальнай праблематыкі ў свеце.

### Литература

1. Белорусизация и украинизация в условиях трансформации советской национальной политики (1920-1930-е годы) (дисциплина специализации) : учебная программа учреждения высшего образования по учебной дисциплине для специальности: 1-21 03 01-01 "История (отечественная и всеобщая)", 1-21 03 01-01 04 "История Беларуси нового и новейшего времени" / сост.: М. И. Старовойтов ; Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины. - Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – 28 с.

2. Максімчык, А. М. Этнічныя групы Беларусі: гісторыя, культура і сацыяльна-прававое становішча. Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-21 80 16 Айчынная гісторыя. № УД-6392/вуч. / А. М. Максімчык. – Мінск: БДУ, 2018. – 23 с.

3. Розенблат Е. С. Проблемы этнической истории Беларуси : учебно-методический комплекс для студентов второй ступени высшего образования (магистратура) исторического факультета специальности «История» / Е. С. Розенблат. – Брест : Изд-во БрГУ имени А. С. Пушкина, 2020. – 163 с.

4. Беларусь – страна мира и согласия. Материалы к единому дню информирования населения. Декабрь 2024 г. [Электронный ресурс] / Минский городской исполнительный комитет. – Режим доступа: https://minsk.gov.by/ru/actual/view/209/2024/inf_material_2024_12.docx